**М. П. ЖЫГАЛАВА,**
доктар педагагічных навук, прафесар кафедры лінгвістычных дысцыплін і міжкультурных камунікацый
Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, заслужаная настаўніца Беларусі

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ І АНАЛІЗ МАСТАЦКАГА ТВОРА ЯК СРОДАК ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ НАВУЧЭНЦАЎ

Вядома, што літаратурныя творы даюць магчымасць чытачу дакрануцца да нацыянальных эстэтычных і маральных каштоўнасцей, спрыяюць фарміраванню духоўнасці і маральнасці асобы. Найбольш яскрава гэта праяўляецца ў час інтэрпрэтацыі і аналізу мастацкіх тэкстаў, дзе пытанні ўзаемадзеяння мовы, культуры, чалавека з'яўляюцца неад'емнай часткай штодзённага існавання.

У працэсе звароту чытача да розных тыпаў тэкстаў адбываецца ўспрыманне і засваенне маральных каштоўнасцей, паколькі кожны чытач кіруецца ўласнымі ведамі і культурным досведам, назапашаным у межах яго існавання ў пэўным сацыяльным і нацыянальна-культурным асяроддзі. Для настаўніка асабліва важна ўсведамляць, як у тэксце адлюстроўваюцца духоўныя і маральныя каштоўнасці [5], як яны ўвасабляюцца ў вобразах, тэматыцы і моўных сродках, а таксама разумець працэс узаемапранікнення мовы і культуры. Гэта дазволіць на ўроках і ў час арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці старшакласнікаў [3], скіраванай на вывучэнне, інтэрпрэтацыю і аналіз мастацкага твора, мэтанакіравана акцэнтаваць увагу вучняў на асэнсаванні вечных маральных каштоўнасцей, што спрыяюць выхаванню асобы чытача і фарміраванню яго светапогляду [4].

У Брэсцкім абласным інстытуце развіцця адукацыі на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў-філолагаў, якія праводзіліся мною з 1984 па 2020 год, былі ўкаранёны аўтарскія методыкі працы з мастацкім тэкстам ва ўстановах агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі [2]. На іх аснове была прапанавана тэхналогія аналізу літаратурнага твора, якая паспяхова выкарыстоўваецца педагогамі Брэстчыны. Як адзначаюць самі настаўнікі, яна спрыяе развіццю ў навучэнцаў **уменняў**:

- успрымаць мастацкі твор як элемент і адлюстраванне культурнага досведу, дзе адлюстроўваюцца побыт, звычаі, традыцыі і інш.;
- разумець тэкст як магчымы гістарычны дакумент, які рэпрэзентуе сацыяльна-грамадскія з'явы пэўнай эпохі;
- усведамляць мастацкі твор як увасабленне менталітэту чалавека, народа;
- разглядаць тэкст як каштоўны помнік мастацкай думкі і нацыянальнай культуры.

Зазначым, што ў мастацкім творы закладзены не толькі жыццёвы досвед аўтара, але і вопыт папярэдніх пакаленняў, культур розных народаў і нават усяго чалавецтва. Раскрыць гэтыя грані твора і, адпаведна, спасцігнуць карціну свету, адлюстраваную ў ім, а таксама выйсці на шырокія філасофскія абагульненні дапамагае комплексны аналіз мастацкага тэксту.

Мы прапануем разглядаць тэкст як спецыфічны сродак уплыву нацыянальнай, этнічнай і духоўна-маральнай культуры аўтара на інтэрпрэтацыю і асэнсаванне чытачом матэрыяльнага і духоўнага зместу, закладзенага ў мастацкім творы.

На прыкладзе дадзенай тэхналогіі аналізу [1] і з улікам педагагічнай апрабацыі, праведзенай на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў-філолагаў Брэстчыны [7], пакажам, як у працэсе інтэрпрэтацыі і аналізу верша Ніны Мацяш «Балада мары» педагогі ўспрынялі і асэнсавалі матэрыял, авалодалі

прымяненнем тэхналогіі аналізу на практыцы, а таксама як яна спрыяе фарміраванню духоўных і маральных каштоўнасцей у рэцыпіентаў. Найперш цалкам прывядзём паэтычны тэкст.

**Балада мары**

Дзівосным пер'ем грае цёплы птах, —
Ажно шчыміць і замірае сэрца
Ва ўзбуджана-шчаслівай паняверцы
Раскошу гэту бачыць блізка так.

І рукі ўзлятаюць да яе,
І пальцы чуюць трапятлівасць цела!
Але,
зіхоткая,
амаль нясмела
Ірвецца птушка прэч
і растае...

Асірацела гойдаецца трон —
Вечназялёны куст, што цуд той гушкаў.
Была такой вясёлкаваю птушка —
Скуль на далоні чорнае пяро?

*1974*

Інтэрпрэтацыя і аналіз верша пачынаецца з выяўлення чытацкага ўспрымання. Вось як пра свае ўражанні піша адна з настаўніц, якая была слухачкай курсаў: «Пра што марыць кожны з нас? Напэўна, кожны — пра сваё... Дзіця — хутчэй стаць дарослым, студэнт — паспяхова скончыць універсітэт, спартсмен — заваяваць "золата" на Алімпійскіх гульнях. Маці — каб яе дзеці былі здаровыя і шчаслівыя... А пра што можа марыць чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, маладая жанчына, якой 31? Пра гэта верш беларускай паэткі Ніны Мацяш, лёс якой быў няпросты».

Важную ролю пры аналізе верша адыгрывае выяўленне датэкставай фонавай інфармацыі, якая звычайна звязана з асобнымі старонкамі біяграфіі аўтара і тэмамі, матывамі яго творчасці. Настаўніца працягвае: «Каб супрацьстаяць выпрабаванням, што выпалі на долю паэткі, спатрэбілася вялікая мужнасць. Нарадзіцца ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1943 г.) — ужо сам па сабе подзвіг, а ўсвядоміць, што ніколі не зможаш устаць на ўласныя ногі і на ўсё жыццё прыкаваны да інваліднага вазка, — гэта ўжо не проста подзвіг, а вечная барацьба за права жыць і тварыць на зямлі. Гэта цяжкае выпрабаванне на трываласць. Упершыню хвароба дала пра сябе знаць у 1960 годзе, калі Ніна Мацяш была студэнткай першага курса Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў. Маладая дзяўчына вымушана была ўзяць акадэмічны адпачынак. Але гэта яе не спыніла — неўзабаве яна вяртаецца да вучобы, здаўшы экстэрнам экзамены за тры курсы. Пасля заканчэння інстытута, нягледзячы на хваробу, яна працуе настаўніцай, актыўна друкуецца ў газетах, займаецца мастацкім перакладам, піша для дзяцей, яе п'есы ставяцца на сцэне...»

Лірыка Ніны Мацяш прасякнута аптымізмам, любоўю да людзей, да жыцця, верай у мару. Апрача гэтага, душа яе поўнілася смуткам. Магчыма, менавіта ў такі момант і быў створаны верш пра мару, што ўвайшоў у зборнік выбранай паэзіі «Паварот на лета» (1986) [6], канцэпцыя якога дакладна адлюстроўвае лёс паэткі: «Лёс мой, // лёс мой — цяжкі колас, // часам — цяжкі камень...»

Выяўляючы тэму і ідэю верша праз вызначэнне ключавых пазіцый (назва, першая і апошняя фразы, дамінантныя і ключавыя словы), адзначым, што вершы з гэтага зборніка выклікаюць у чытача пачуццё спачування і глыбокага суму. Яны насычаны філасофскімі разважаннямі пра шчасце, каханне і чалавечы лёс.

Назва верша «Балада мары» гаворыць сама за сябе, бо аб'ядноўвае два паняцці: «балада» і «мара». Першае азначае 'гімн гераізму, аповед пра нешта незвычайнае', а «мара» — уяўленне пра нешта таямнічае. Пры чытанні гэтых вершаваных радкоў невыпадкова ўзнікае асацыятыўны шэраг: святло — надзея — палёт — крылы — птушка. Менавіта вобраз-сімвал птушкі выбрала Ніна Мацяш для сваіх філасофскіх разважанняў пра шчасце.

Першая страфа верша напоўнена пачуццём радаснага хвалявання: перад вачыма чытача паўстае незвычайная, казачная птушка. Яе апярэнне пераліваецца на святле («пер'ем грае») цёплымі колерамі, што традыцыйна асацыіруецца з радасцю, святам і шчасцем. І сапраўды, ад убачанага цуду сэрца чытача напаўняецца захапленнем, і ён нібы не хоча верыць сваім вачам («Ажно шчыміць і замірае сэрца...»), цягнецца да птушкі, адчуваючы яе блізкасць: «І рукі ўзлятаюць да яе, // І пальцы чуюць трапятлівасць цела!» Вобраз птушкі сімвалізуе чалавечую мару пра шчасце.

Аналіз мовы і мастацка-выяўленчых сродкаў дапамагае раскрыць дынаміку развіцця характару лірычнага героя. Калі казаць пра характар лірычнай гераіні, то гэта моцная асоба. І хоць яна не выказвае сваю пазіцыю адкрыта, аднак яе сутнасць выяўляецца ў лірычных перажываннях. Паэтка не выкарыстоўвае форму першай асобы, а звяртаецца да абагульненага вобраза, перадаючы толькі стан душы, бо

пачуцці перапаўняюць яе: «шчыміць і замірае сэрца».

Чытач міжволі таксама цягне рукі да птушкі шчасця, адчуваючы яе трапяткое цяпло. На жаль, часта чалавек перажывае горыч расчаравання: раптам тое, у што верыў, чым жыў і пра што марыў, абрываецца і знікае. Асабліва балюча — страціць мару пра шчасце, якое здавалася ўжо зусім побач, калі сэрца цалкам паверыла ў яго. Нечакана ўсё руйнуецца: свет становіцца сумным і апусцелым, жыццё — быццам без будучыні («Асірацела гойдаецца трон...»), хоць яшчэ нядаўна яно было напоўнена колерамі і святлом...

Важную ролю пры аналізе верша адыгрывае каларыстыка. Чытачы адзначаюць, што ў вершы Н. Мацяш раптоўна і рэзка з'яўляецца чорны колер — колер смутку, жалобы, гора і безвыходнасці. Вядома, што чалавек жыве да той пары, пакуль верыць і марыць. Мара дае яму крылы, кліча да здзяйсненняў і подзвігаў — вялікіх і малых, напаўняе жыццё сэнсам, бо без мары яно становіцца змрочным, сумным, бязрадасным.

Каларыстычная насычанасць верша — досыць сціплая, але адначасова вельмі значная. Чорны колер супрацьпастаўлены вобразу вясёлкавай, рознакаляровай птушкі, што, можна сказаць, асвятляе пачатак твора («Дзівосным пер'ем грае цёплы птах...»).

Рэзкі кантраст настрою, стану душы лірычнай гераіні паэтка стварае і з дапамогай кантэкстуальных антонімаў: «дзівосным пер'ем» — «чорнае пяро»; «шчаслівай» — «асірацела»; «грае пер'ем» — «ірвецца... і растае».

Асаблівую сэнсавую нагрузку нясе апошні пытальны сказ. Гераіня збянтэжаная, яна не разумее, што адбылося: адкуль? чаму? навошта? Адказы на гэтыя пытанні раскрываюць асноўную ідэю верша: лёс кожнага з нас непрадказальны, бо ўсё — нават штосьці дрэннае — можа здарыцца раптоўна. І тады чалавек, на жаль, страчвае веру ў сябе, губляе мару, а разам з ёй — і сэнс жыцця.

Верш заканчваецца на сумнай ноце, але чытачу хочацца верыць, што страта мары, шчасця і веры — з'ява нявечная, часовая. Калі ты моцная асоба, верыш ва ўласныя сілы і ўмееш арганізаваць сябе, абавязкова з'явіцца новая мара, а разам з ёю і сэнс жыцця.

Як бачым, дзякуючы інтэрпрэтацыі і аналізу тэксту чытач можа ўбачыць цэлую гісторыю жыцця, прасачыць дынаміку няпростага чалавечага лёсу, зразумець не толькі знешні, але і ўнутраны свет паэткі, яе характар, псіхалогію, а таксама асэнсаваць карціну свету, створаную Нінай Мацяш. Гэта, у сваю чаргу, прымушае зазірнуць у сябе, задумацца пра тое, што сапраўды важнае ў чалавечым жыцці, — маральныя асновы і духоўныя каштоўнасці.

Прапанаваны намі аналіз паэтычнага тэксту характарызуецца комплексным падыходам, які ўключае ўспрыманне, інтэрпрэтацыю і вывучэнне яго сэнсава-семантычнага напаўнення, вобразнай мовы, сімволікі і каларыстыкі, што дазваляе раскрыць шматграннасць мастацкага свету твора. Каштоўнасць такой методыкі заключаецца ў тым, што яна павышае ўзровень разумення і асэнсавання тэксту, спрыяе аналітычнай працы па фарміраванні ў навучэнцаў здольнасці аналізаваць мастацкую літаратуру на глыбокім духоўна-маральным, псіхалагічным і эстэтычным узроўні.

**Спіс выкарыстанай і рэкамендаванай літаратуры**


1. *Жигалова, М. П.* Интерпретация и анализ в литературе: теория и практика : монография / М. П. Жигалова ; Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. — 2-е изд., доп. — Брест : БрГУ, 2011. — 269 с.
2. *Жигалова, М. П.* Интеграция материальных и духовных ценностей в подготовке учителя-филолога для работы в поликультурной среде: теоретический аспект / М. П. Жигалова // Подготовка педагога основного общего образования: вызовы времени и стратегии реализации : сб. науч. трудов / под ред. Р. А. Валеевой. — Казань : Отечество, 2017. — С. 116—122.
3. *Жигалова, М. П.* Организация учебно-познавательной деятельности старшеклассников при филологическом анализе / М. П. Жигалова // Русская словесность. — 2004. — № 5. — С. 61—64.
4. *Жигалова, М. П.* Познавательно-воспитательное значение идейно-тематического содержания литературного произведения: теория и практика / М. П. Жигалова // Адукацыя і выхаванне. — 2024. — № 5. — С. 65—73; — № 6. — С. 67—73.
5. *Жигалова, М. П.* Филологический анализ художественного произведения как межкультурного универсума : учеб.-метод. пособие / М. П. Жигалова. — Брест : БрГУ, 2014. — 116 с.
6. *Мацяш, Н.* Паварот на лета : вершы, паэмы / Ніна Мацяш. — Мінск : Маст. літ., 1986. — 157 с.
7. Современные технологии обучения в образовании взрослых : учеб.-метод. пособие / М. П. Жигалова [и др.] ; под общ. ред. М. П. Жигаловой ; Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. — Брест : БрГУ, 2013. — 103 с.